**БЕЛАРУСКАЯ ДУДА Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКІХ АНАЛАГАЎ**

**Сурба А. В.**
*майстар народных музычных інструментаў,*
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Бадай кожны еўрапейскі чалавек ведае што такое Шатландзкая дуда. Гук, канструкцыя і дэкор гэтага інструмента напамінаюць пра ганаровых горцаў, пра Шатландыю ды й пра Брытанію. Дуда, альбо «валынка» у гэтых мясцінах завецца «бэгпайп», альбо Грэйт Хайлэнд Бэгпайп – высакагорная шатландзкая дуда. Гэты інструмент быў распрацаваны ангельскімі віктарыянскімі вайскоўцамі ў XIX ст. і быў распаўсюджаны па ўсіх краях Брытанскай Імперыі. Прататыпам яго з’яўлялася народная дуда, якая мела іншы выгляд, але з’яўляла сабой спрадвечную традыцыю вырабу і музычнага выканання. Свайму росквіту папулярнасці ў свеце, Шатландзкая дуда абавязана спецыяльнай тэхніцы «piob mhor», якая была распрацавана прадстаўнікамі вядучых кланаў ў XVII–XVIII стст. І базавалася на прынцыпах кананічнай імправізацыі [1].

Сапраўдны шок адчуваюць наведвальнікі музеяў, а таксама папулярных у апошні час «дударскіх фэстаў», калі чуюць пра тое, што інструмент накшталт «шатландскай дуды» існаваў ва ўсіх народнасцях ад Гішпаніі да Індыі, а таксама ад Паўночнай Афрыкі да Скандынавіі. Сапраўды ў XX ст. адбываліся працэсы досыць неадназначныя, што адбілася на культываванні і ўжыванні гэтага «містычнага» інструменту. Толькі ў кан. 60-х гадоў на хвалі «хіпі-руху» моладзь пачынае цікавіцца спадчынай сваіх продкаў і рабіць першыя крокі ў рэстаўрацыі і аднаўленні сваіх нацыянальных дуд. Адным з першых прафесійных маўстроў быў Рэмі Дзюбуа ў Францыі. Ён на падставе іканаграфічных помнікаў, а таксама музейных экспанатаў распрацаваў тэхналогію вырабу французкіх дудаў – музетаў ды карнемузаў. У гэты ж час у Еўропе набірае рух этнічнай музыкі і танцаў; з’яўляюцца выдатныя музыкі, якія граюць на дудах.

Сярод іх быў і выдатны ірландскі музыка Падзі Кінан. Ён адзін з першых удакладніў канструкцыю ірландскай дуды – Уліян Пайп. Кінан авалодаў сотнямі этнічных ірландска-кельцкіх мелодымі, распрацаваў тэхніку ігры і стаў адным з галоўных ідэолагаў дударскага-кельцкага руху ў свеце.

Такім чынам, мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца: раскрыць асноўную тыпалогію дуд Еўрапейскага асяроддзя, паказаць месца беларускай дуды ў гэтай сістэме, апісаць асноўныя тэндэнцыі «дударскага руху» ў Беларусі.

Адзін з першых, хто пачаў займацца праблемай навуковай класіфікацыі дудаў свету ў Музеі «Піта Рыверса» ў Кэбрыджы, быў Генры Балфар. Яго аўтарству належыць фундаментальная праца, прысвечаная ражкам, другой часткай павінна была быць кніга прысвечаная дудам, але яна так і не выйшла. Натхнёныя ідэямі Балфура, маладыя еўрапейскія навукоўцы распачалі фіксацыю і даследаванне сваіх традыцый, але, паводле Энтані Бейнса, яны амаль нічога не далі сусветнаму навуковаму грамадству, бо не прывадзілі выяваў сваіх інструментаў, а таксама былі вузка-патрыятычна скіраванымі [1].

Першым даследчыкам, які распрацаваў навуковую сістэму для класіфікацыі гэтага інструмента, быў Э. Бейнс. Для гэтага ен скарыстаў агульную таксанамічную схему, прапанаваную прафесарам Куртам Заксам у 1930-я гады. У яго сістэму ўпісаны ўсе дуды, вядомыя на сёняшні дзень. Бейнс выдзяляе некалькі прынцыповых груп дуд: 1) прымітыўныя дуды, 2) усходнееўрапейскія, 3) цампонія, 4) заходнееўрапейскія, а таксама падзяленне па прынцыпу канічнасці і цыліндрычнасці ігравой трубкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дуда канструкцыйна спалучае некклькі базавых элементаў: мех, меладычныя трубкі, удвуўная трубка. Гук генеруецца тросцю, якая ўстаўляецца ў меладычныя трубкі. Яна мае выгляд пласцінкі, якая пад ўздзеяннем ціску паветра вібруе ў ствале трубкі.

Трубкі падзяляюцца на: асноўную меладычную трубку і трубкі-бурдоны. На меладычнай трубке граеецца мелодыя, трубкі-бурдоны гучаць пастаянна, іх колькасць можа даходзіць да трох.

Звычайна тэхніка грання спалучаецца з некалькіх стадыяў: спачатку мех бярэцца пад левую руку, затым надзмуваецца паветра праз удуўную трубку, затым левай рукой націкаецца мех, паветра раўнамерна паступае ва ўсе трубкі, генеруючы гукі align рознай вышыні; затым на меладычнай трубцы пераборам адтулін граецца асноўная мелодыя. Кантроль за падачай паветра ажыцяўляе спецыяльны клапан, які запіраецца пасля таго як паветра было надзмюта. Гэты цыкл паўтараецца прыкладна з такім жа перыядам, з якім музыка сам дышыць паветрам: праз нос удыхае, а праз удуўную трубку выдыхае.

Мех звычайна робіцца са скуры аўцы, цяляці а таксама казы. Для гэтага скура здымаецца чуўком, альбо разразаецца і шыецца праз тасьму. Потым яна апрацоўваецца такімі рэчывамі як: сала, дзёгаць, пакост і інш.

Меладычныя трубкі звычайна робяцца з дрэва, аднак больш старажытныя цэлікам з косці, альбо чароту. У іх свідруюцца адтуліны ў адпаведнасці с меладычным строем. Бурдоны звычайна драўляныя цэльныя, а больш познія маюць спецыяльны «слайд» для падстройкі гуку пад танальнасць меладычнай трубкі. Гук бурдону мае вельмі моцныя абертаны, што нават калі іх небачна, бывае цяжка сказаць колькі іх.

У цэлым, калі абапірацца на сістэму Э. Бейнса, можна сказаць пра агульную для ўсёй Еўропы дыхатамію: канічных і цыліндрычных дуд. Канічныя дуды маюць характэрны ўнутраны канал трубак у выглядзе ўсечанага конуса і адпаведна падвойнага пішчыка, а цыліндрычныя – цыліндр з адзінарным пішчыкам.

Еўрапейскія дуды маюць самую розную тыпалогію, канструкцыю і дэкор. Пачынаючы ад прымітыўных інструментаў Поўдня, скончваючы досыць складанай канструкцыяй Ірландскай дуды.

Пачнем з канічных дудаў. Першым класічным яе прадстаўнікам з'яўляецца шатландскі Грэйт Хайлэнд Бэгпайн.

Гэтая дуда класічна робіцца з чорнага дрэва – грэнадзіл, альбо эбані. Белыя кольцы раней рабіліся са слановай касці, зараз – з пластыку. Спалучае тры бурдоны, якія завуцца дроны: два ценары і адзін бас. Канал дронаў пераменны цыліндрычны. Канал іграваой трубкі (чантар) канічны. Мех скураны, зверху абшыт тканінай-коверам, звычайна адпаведае малюнку клана.

Гішпанская дуда – Гайта Галлега, з'яўляецца прамым аналагам Шатландскай дуды, канструкцыйна і тыпалагічна поўнасцю супадае, апрача дэкора.

Звычайна робіцца з мясцовага матэрырылу – самшыту, аднак таксама сустракаецца чорнае і чырвонае дрэва. Інкрустацыя косцю, а таксама волавам; у апошні час шмат выкарыстаюцца пластыкі, такія як эбаніт, акрылацэтат і інш.

Італійская дуда – цампонія, паўстала як прамы патомак старажытнагрэцкага аўласа (падвойнага безмяховага духавога інструмента). Спалучае некалькі канічных трубак, устаўленых ў адзін драўляны сток. Мае дзве меладычныя трубкі і некалькі бурдонаў. Робіцца з самшыту, грушы, клёну.

Нямецкая дуда – шафершайп. На сёняшні дзень не захавалася ніводнага інструмента такога кшталту. Уся рэканструкцыя абапіраецца на іканаграфію, а таксама на апісаннях гэтага інструмента М.Прэторыуса. Шаферфайп быў пераважна пастушым інструментам. Зараз робіцца з чорнага, чырвонага дрэва, а таксама з клёну.

Дуды цыліндрычнай групы маюць драўляныя трубкі, выпаленыя, альбо прасвідраваныя свярдзёлкам, а таксама праточаныя на такарным станку. Прынцып функцыянавання перанят ад цыліндрычнага чароту з надрэзаным пішчыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першым тыповым прадстаўніком цыліндрычнай группы з'яўляецца румынская дуда – чымпоі. Яе асаблівасцю з'яўляецца іграавая трубка з падвойным каналам, адна з іх выконвае функцыю бурдона, другая – меладычнай трубкі. З ніжняга тарца мантуецца спецыяльны ражок «рог», які робіцца з цэльнага кавалку дрэва (пераважна з сасны) і мае вуглаватую альбо закругленую форму.

Наступным тыповым цыліндрычным інструментам з'яўляецца «Бок», распаўсюджаны ў межах Польшчы, Усходняй Германіі і Чэхіі. Інструмент спалучае цыліндрычныя трубкі, на тарцах умантаваны рогі з латуннымі падаўжэннямі. Інструмент дэкараван волавам, латунню, а таксама галавой казла, натуральнай, альбо выразанай з дрэва.

Беларуская дуда – тыповы інструмент цыліндрычнай групы. Паводле этнаграфічных звестак, перабор беларускай дуды рабіўся з дрэва (клён, бэз, ябланя, вішня), меў 6–8 іграавых адтулін, пад якія выразаюцца спецыяльныя паглыбленні для пальцаў выканаўцы. Тэхналогія вырабу перабора была на аснове пражыгання ўнутранага канала металічным прутом, а таксама адтулін. Таму яго канал мог быць толькі цыліндрычным. З верхняга тарца мантуецца пішчык з чароту (тыповая з'ява для усіх дудаў з цыліндрычным каналам). Гук састаўны на слайдзе, інкруставаны металам (волава, жалеза), мае пастаянны дыяметр унутранага канала (каля 6–8 мм.). Мех шыты са скуры цяляці, альбо казы [2]. Самым асаблівым элементам беларускай дуды з'яўляецца наяўнасць раструбаў-ражкоў. Хаця тыпавыя ражкі сустракаюцца і ў іншых традыцыях дадзенй групы, іх форма ўнікальна і не мае прамых аналагаў.

Нажаль, беларускія дуды ў большасці захоўваюцца ў музеях замежных дзяржаў (Літва, Расія). У экспазіцыях Беларусі дуды прадстаўлены ў дзвух музеях: Лепельскі краязнаўчы музей і Гродзенскі археалагічны музей. Лепельская дуда поўнасцю адпавядае этнаграфічным апісанням XIX ст. Гродзенская дуда досыць унікальная і самабытная. Усе яе драўляныя часткі нагадваюць беларускую дуду, але мех мае некласічную рамбічную форму, а таксама адсутнічае ражок на жалейцы. Пры дэтальным вывучынні яе канструкцыі, мы зрабілі вывад, што мех мог быць зроблен пазней ад асноўных драўляных частак. Неаднаразова крыніцы указваюць на тое, што мех пастаянна апрацоўваўся рознымі рэчывамі для герметычнасці [2, 3]. Мех Гродзенскай дуды зроблен з медыцынскай кіслароднай падушкі, абцягнутай скурай. У шланг з верхняга тарца устаўлена драўляная трубка, якая служыць для ўдування. На месцы ражка з тарца жалейка вельмі яскрава прагледжваецца пасадка на ражок. Пра гэта сведчаць ніткі, якія звычайна наматвалі на трубку, для плотнага сапражэння з ражком.

На падставе этнаграфічным звестак і музейных аналагаў (Лепельскі краязнаўчы музей, Расійскі Этнаграфічны Музей) мы рэканструявалі ражок ў стылі таго ражка, які захаваўся на бурдоне.

Такім чынам музей атрымаў магчымасць дэманстраваць дуду цэласна, што паспрыяе папулярызацыі і вяртанню нацыянальнага інструмента.

Такім чынам, працэсы, якія праходзілі ў Еўропе, неабышлі стараной і Беларусь. Цікавасць да этнічных іструментаў з'явілася ў 70-я гады XX ст. Аднымі з першых у гэтай галіне працавалі: І.Назіна, А. Лось, У. Пузыня, У. Гром [4]. Зараз набраў абарот так званы «дударскі рух». Свае першыя крокі ён пачаў рабіць ў 2005 годзе. Зараз на вечарыны дударскага клубу прыходзяць каля 200 чалавек, якія цікавяцца дудамі і ўсім што з імі звязана [5]. Але трэба адмеціць адсутнасць пэўнай скіраванасці да беларускай дуды, бо гэтая хваля праходзіць досыць касмапалітычна з цікавасцю да ўсіх дудаў свету. На наш погляд, працэсы агульнага зацікаўлення дудамі прывядуць да разумення нашай культуры, як самабытнай; нашай традыцыі, як аўтахтоннай і ў выніку да комплекснага асмыслення месца дударскай культурнай спадчыны Беларусі ў Еўрапейскай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Літаратура***

1. Baines, A. Bagpipes. Pitt Rivers museum Univercity of Oxford / A. Baines, 1960.
2. Романов, Е. Р. Вымирающий инструмент / Е. Р. Романов. – Вильно, 1909.
3. Никифоровский, Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии. Дудар и Музыка. Этнографическое обозрение. Кн. 13–14, № 2–3 / Н. Я. Никифоровский. – Витебск, 1892.
4. Сурба, А. В. Дуды-навадзелы і іх месца ў сучаснай музычнай прасторы Беларусі / А. В. Сурба // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества / под ред. В. А. Мищенко. – Минск, 2010.
5. Гісторыя дударскіх фэстаў [Электронны рэсурс]. – Мінск, 2010. – Рэжым доступу: http: //www.dudar.info. – Дата доступу: 15.11.2010.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ